# ЛІТВІНСКА-ПОЛЬСКІЯ УЗАЕМААДНОСІНЫ КАНЦА XIV – СЯРЭДЗІНЫ XVI СТ. У ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ XIX – ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XX СТ.

Л.В. Мікалаева, к.г.н., дацэнт
УА “БДУІР”, г. Мінск

У ліку найважнейшых кірункаў польскай гістарыяграфіі па-ранейшаму застаецца даследаванне ўзаемаадносін Каралеўства Польскага з Вялікім Княствам Літоўскім (далей – ВКЛ). З улікам лімітаванага аб’ёму публікацыі немагчыма падрабязна разгледзець нават самыя ключавыя аспекты тэмы. Таму мы спынімся на кароткай характарыстыцы творчасць польскіх гісторыкаў, якія займаліся праблемамі літвінска-польскіх дачыненняў перыяду канца XIV – сярэдзіны XVI ст.

Пачынальнікам сур’ёзнага навуковага падыходу да вывучэння заяўленай праблемы ў польскай гістарычнай навуцы можа лічыцца “бацька польскай рамантычнай гістарыяграфіі” і заснавальнік т.зв “лелявелеўскай” гістарычнай школы Іаахім Лялевель (1786 – 1861), аўтар даследаванняў па палітычнай гісторыі ВКЛ і Польшчы [1]. Традыцыі І. Лялевеля працягнулі прызнаны глава кракаўскай гістарыяграфічнай школы Юзаф Шуйскі (1835 – 1883) [2] і граф Казімір Стадніцкі (1808 – 1886), навуковыя інтарэсы якога ахоплівалі пытанні сярэдневечнай гісторыі ВКЛ [3].

Аднак актывізацыя даследаванняў па азначанай праблематыцы адбылася толькі на мяжы XIX – XX стст., калі пабачылі свет працы такіх гісторыкаў як Анатоль Лявіцкі (1841 – 1899), Францішак Чорны, Міхал Бобжыньскі (1849 – 1935), Казімір Костра-Пулаўскі (1846 – 1926), Станіслаў Кутшэба (1876 – 1946), Уладзіслаў Сямковіч (1878 – 1949), Людвік Фінкель (1858 – 1930), Фрыдэрык Папэ (1856 – 1940), Віктар Чэрмак (1863 – 1913), Освальд Бальцэр (1858 – 1933), Людвік Калянкоўскі (1882 – 1956) і інш. [4]. Да гэтага часу адносіцца і выданне шматтомнай працы ўраджэнца Гнезна Якаба Каро (1935 – 1904) [5], перакладзенай на польскую мову яшчэ пры жыцці аўтара. Сярод публікацый польскіх навукоўцаў мяжы XIX – XX стст., дзе разгледжаны адносіны паміж ВКЛ і Польшчай, даследчыкамі асабліва вылучаецца абагульняючая праца С. Кутшэбы “Нарыс гісторыі дзяржаўнага і грамадскага ладу Польшчы” (у 4 т., 1905 – 1917; рускі пераклад, т. 1, 1917) [6], у якой аўтар упершыню прапанаваў разгляд літвінска-польскіх адносін з гісторыка-прававога пункту гледжання [7, s. 32]. Другі том працы С. Кутшэбы быў прысвечаны ВКЛ, а сам аўтар праз некалькі гадоў здабыў рэпутацыю эксперта па гісторыі літвінска-польскіх адносін. У 1914 г. з’явіўся яго артыкул “Унія Польшчы з Літвой” [8]. Аднак свядомая канцэнтрацыя даследчыка на пытаннях прававога характару не дазволіла яму з усёй паўнатой разгледзець палітычную спецыфікую стасункаў ВКЛ і Польшчы [7, s. 33].

Меркаванні С. Кутшэбы не падзяляў іншы буйны знаўца літвінска-польскіх адносін О. Бальцэр, які пачаў палеміку на старонках “Квартальніка

гістарычнага”. Таксама вядомыя яго ўніверсітэцкія лекцыі, якія, нягледзячы на забарону О. Бальцэра іх публікаваць, былі выдадзены пасля яго смерці [9].

У 1932 г. С. Кутшэба надрукаваў знакаміты збор дакументаў, маючых дачыненне да ўній ВКЛ з Польшчай [10], у чым яму дапамог У. Сямковіч, ужо вядомы ў той час сфрагіст, даследчык генеалогіі, геральдыст, які шмат увагі надаў вывучэнню “гербавага брацтва” літоўскага баярства з польскай шляхтай у сувязі з заключэннем Гарадзельскай уніі 1413 г. [11].

Падсумаваннем амаль 30-гадовых даследаванняў Ф. Папэ, стала яго грунтоўная манаграфія, прысвечаная літвінска-польскім адносінам і апублікаваная ў 1903 г. у Кракаве [12]. Прадметам асаблівага зацікаўлення аўтара стаў перыяд 1480 – 1506 гг., які меў свае асаблівасці, звязаныя са зменамі ў грамадска-палітычным жыцці ВКЛ і Польшчы, а таксама ў іх знешняй палітыцы.

Напярэдадні Першай сусветнай вайны значнай падзеяй ў польскай гістарыяграфіі стаў выхад працы Л. Фінкеля, прысвечанай польска-літвінскай уніі і справе выбараў Жыгімонта Казіміравіча на троны ВКЛ і Польшчы [13]. Грунтоўнасць працы Л. Фінкеля надалі новыя крыніцы, выяўленыя ў архівах Германіі, Аўстрыі, Венгрыі, Расіі і Італіі. Таксама ён упершыню звярнуў увагу на ролю “дынастычнага фактара” ў справе заключэння ўніі паміж ВКЛ і Польшчай.

У час Другой Рэчы Паспалітай новымі публікацыямі заявілі аб сабе Оскар Халецкі (1891 – 1973), Ян Дамброўскі (1890 – 1965), Марыян Гумоўскі (1881 – 1974), Аліна Вількевіч-Ваўжыньчыкава (1908 – 1997), Хенрык Лаўмяньскі (1898 – 1984), а таксама працягвалі працу ўжо згаданыя Л. Калянкоўскі, С. Кутшеба і Ф. Папэ [14]. Адной з ключавых праблем польскай гістарыяграфіі гэтага перыяду стала польска-літвінская ўнія, інтарэс да якой падаграваўся яшчэ і палітычнай каньюнктурай. У гэты час былі напісаны класічныя працы Л. Калянкоўскага, прысвечаныя даследаванню ўплыву дынастыі Ягелонаў на справу ўніі ВКЛ і Польшчы. Гэты вучань Л. Фінкеля, працягваючы вывучэнне ўплыву “дынастычнага фактара”, адзначыў несупадзенне інтарэсаў дынастыі з больш шчыльным польска-літвінскім саюзам падчас кіравання Жыгімонта Старога. Даследчык таксама падрыхтаваў шэраг работ, прысвечаных пэўным пытанням польска-літвінскіх адносін, такіх як Гарадзельская ўнія ці элекцыя Жыгімонта Казіміравіча [15].

Такім чынам, у разглядаемы перыяд польскія даследчыкі ўнеслі значны уклад у даследаванне польска-літвінскіх адносін, стварыўшы грунтоўны падмурак для далейшых пакаленняў гісторыкаў.

Літаратура

1. Lelewel, J. Dzieje Litwy i Rusi aż do unji z Polską w Lublinie 1569 zawartej/ J. Lelewel. – Poznań: Nakładem i drukiem W. Stefańskiego, 1844. – 202 s.; Lelewel, J. Dzieła/ J. Lelewel. – Warszawa: Państwowe wydawnictwo naukowe, 1962. – T.6: Historia polska do konca panowania Stefana Batorego; Oprac.: Z. Kolankowski. – 540 s.

2. Szujski, J. Dzieje Polski podług ostatnich badań spisane przez Józefa Szujskiego/ J. Szujski. – Lwów: Nakładem Karola Wilda, 1862. – T. 2. Jagielloni.– 340 s.

3. Stadnicki, K. O tronie elekcyjnym domu Jagiellonów w Polsce/ K. Stadnicki. – Lwów: Nakładem Autora, 1880. – 102 s.

4. Lewicki, A. Sprawa unii kościelnej za Jagiełły/ A. Lewicki// Kwartalnik Historyczny. – Kraków: Towarzystwo Historyczne,1887. – № 11. – S. 311–312, 326; Lewicki, A. Zarys historii polskiej aż do najnowszych czasów/ A. Lewicki. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1925. – 512 s.; Lewicki, A. Powstanie Świdrygiełły: ustęp z dziejów unii Litwy z Koroną/ A. Lewicki. – Kraków : Nakładem Akademii Umiejętności, 1892. – 389 s.; Lewicki, A. Nieco o unii Litwy z Koroną/ A. Lewicki// Przegląd Polski. – 1893-1894. – R. 28. – T. II. – S. 235 – 280; Czerny, F. Panowanie Jana Olbrachta i Aleksandra Jagiellończyka (1492–1506)/ F. Czerny. – Kraków: Nakładem Autora, 1871. – 140 s.; Bobrzyński, M. Dzieje Polski w zarysie/ M. Bobrzyński. – Warszawa: Gebethner i Wolff, 1879. – 495 s.; Pułaski, K. Przyczynek do elekcyi Zygmunta I w Litwie i w Polsce/ K. Pułaski// Szkice i poszukiwania historyczne przez K. Pułaskiego. – Kraków: Żupański, 1887. – Serya I. – S. 71 – 73; Czermak, W. Sprawa równouprawnienia schizmatyków i katolików na Litwie (1432–1563)/ W. Czermak// Rozprawy Akademii Umiejętności. Wydział historyczno-filozoficzny. – Kraków, 1903. – Serya II. T. XIX. – S. 348 – 405; Balzer O. Tradycja dziejowa unii polsko-litewskiej/ O. Balzer. – Lwów-Warszawa: Nakładem księgarni Gubrynowicz i syn, 1919. – 24 s.

5. Caro, J. Geschichte Polens/ J. Caro. – Gotha: Perthes, 1886. – Bd. 5. H. 1. 1455 – 1480. – XIII, 500 s.; Caro, J. Dzieje Polski/ J. Caro; przelozył z języka niemieckiego S. Mięczyński. – Warszawa: Skład głowny w księgarni E.Wendego i spółki, 1900. – T. 6 : 1481–1506. – 431 s.

6. Kutrzeba, S. Historja ustroju Polski w zarysie/ S. Kutrzeba. – Lwów: Grafia, 1917. – T. 1. – 292 s.; Kutrzeba, S. Historja ustroju Polski w zarysie/ S. Kutrzeba. – Lwów: Prasa, 1921. – T. 2. – 170 s.

7. Vetulani A. Stanisław Kutrzeba – historyk prawa/ A. Vetulani// Kwartalnik Historyczny. – Kraków: Towarzystwo Historyczne, 1947. – № 54. – S. 32 – 34.

8. Kutrzeba, S. Unia Polski z Litwą/ S. Kutrzeba// Polska i Litwa w dziejowym stosunku. – Krakow etc: Gebethner i Wolff, 1914. – S. 449 – 658.

9. Balzer Oswald Marjan (1858–1933)// Polski słownik biograficzny/ Polska Akademia Nauk, Instytut Historii im. Tadeusza Manteuffla. – Warszawa: Instytut Historii PAN, – Kraków, Polska Akademia Umiejętności, – Wrocław [etc.], Ossolineum, 1935. – T. 1. Abakanowicz Abdank Bruno – Beynart Wojciech. – S. 246.

10. Akta unji Polski z Litwą. 1385 – 1791/ wyd. S. Kutrzeba i W. Semkowicz. – Kraków: Skład głowny w księgarni Gebethnera i Wolffa, 1932. – 633s.

11. Semkowicz, W. O litewskich rodach bojarskich zbratanych ze szlachtą polską w Horodle roku 1413/ W. Semkowicz// Miesięcznik Heraldyczny. Organ

Towarzystwa Heraldycznego we Lwowie. – 1913. – R. 6. – № 11 – 12. – S. 176 – 190; 1914. – R. 7. – № 3 – 4. – S. 51 – 59; Semkowicz, W. Braterstwo szlachty polskiej z bojarstwem litewskiem w unii horodelskiej 1413 roku/ W. Semkowicz// Polska i Litwa w dziejowym stosunku. – Krakow etc: Gebethner i Wolff, 1914. – S. 395 – 446.

12. Papee, F. Polska i Litwa na przełomie wieków średnich/ F. Papee. – Kraków: Gebethner i Wolff, 1904. – T. 1: Ostatynie dwunastolecie Kazimerza Jagiellonczyka. – 422 s.

13. Finkel, L. Elekcya Zygmunta I. Sprawy dynastyi Jagiellonskiej i unii polsko-litewskiej/ L. Finkel. – Kraków: Akademia Umiejętnosci, 1910. – VIII, 296 s.

14. Halecki, O. Dzieje Unii Jagiellonskiej/ O. Halecki. – Kraków: Akademia Umiejętnosci, 1919 – 1920. – T. 1. – 482 s.; T. 2. – 385 s.; Halecki, O. Ostatnie lata Świdrygiełły i sprawa wołyńska za Kazimierza Jagiellończyka/ O. Halecki. – Kraków: Nakładem Akademii Umiejętności; Scład głowny w księgarni Gebethnera i spółki, 1915. – 315 s.; Halecki, O. Litwa, Ruś i Żmudź jako części składowe Wielkiego Księstwa Litewskiego/ O. Halecki// Rozprawy Akademii Umiẹjetności. Wydział historyczno-filozoficzny. – Kraków, 1916. – Serya II. T. XXXIV (59). – S. 214 – 254; Halecki, O. O unji jagiellońskiej (zarys rozwoju)/ O. Halecki. – Warszawa: Wydawnictwo "Przeglądu Dyplomatycznego", 1920. – 383 s.; Halecki, O. Idea Jagiellońska/ O. Halecki// Kwartalnik Historyczny. – 1937. – R. LI. – № 1 – 2. – S. 486–510; Halecki, O. Od unii florenckiej do unii brzeskiej/ O. Halecki; przekł. A.Niclewicz. – Lublin: Instytut Europy Środkowo-Wschodniej, – Rzym: Fundacja Jana Pawła II, 1997. – T. 1. – 270 s.; Dzieje Polski średniowiecznej: w dwu tomach/ Roman Grodecki, Stanisław Zachorowski, Jan Dąbrowski. – Kraków: Nakładem Krakowskiej Spółki Wydawniczej, 1926. – T. 2. – 426 s.; Wilkiewicz-Wawrzyńczykowa A. Spory graniczne polsko-litewskie w XV–XVII/ A. Wilkiewicz-Wawrzyńczykowa// Wiadomości studium historii prawa litewskiego Uniwersytetu Stefana Batorego. – Wilno: Drukarnia artystyczna „Grafika", 1938. – S. 103 – 164; Łowmiański, H. Wcielenie Litwy do Polski w 1386 r. / H. Łowmiański // Lituano-Slavica Posnaniensia. – 1987. – T. 2. – S. 37 – 123; Łowmiański, H. Studja nad początkami społeczeństwa i państwa litewskiego/ H. Łowmiański. – Wilno : Nakład Towarzystwa Przyjaciół Nauk w Wilnie, 1931 – 1932. – T. 1. – XVII, 444 s.; T. 2. – 448 s.; Kolankowski, L. Dzieje Wielkiego księstwa Litewskiego za Jagiellonów/ L. Kolankowski. – Warszawa: Scład głowny: kasa im. Mianowskiego, 1930. – T. 1 (1377 – 1499). – 475 s.; Kolankowski L. Polska Jagiellonów. Dzieje polityczne. – Lwow: Scład główny w księgarni Gubrynowicz i syn, 1936. – 374 s.

15. Gieysztor, A. Kolankowski Ludwik (1882–1956)/ A. Gieysztor// Polski słownik biograficzny/ Polska Akademia Nauk, Instytut Historii im. Tadeusza Manteuffla. – Warszawa: Instytut Historii PAN, – Kraków, Polska Akademia Umiejętności, – Wrocław [etc.], Ossolineum, 1967 – 1968. – T. 13. Klobassa Zręcki Stanisław – Kopernicki Franciszek. – S. 290 – 291.